# ЗАЛОЖНІЦЫ

## З успамінаў Н. І. Заміроўскай, в. Кавалі

Многа цяжкасцей сусрэлася на жыццёвым шляху Ганны Паўлаўны Бацян. Ёй прыйшлося вынесці жудасныя здзекі, турмы, фашысцкія канцлагеры, голад і холад. Доўгімі начамі ў думках Ганны Паўлаўны чарадой праносяцца цяжкія ўспаміны.

… Вёска Кавалі, што ў Малаберастаўіцкім сельсавеце, пры панскай Польшчы далёка славілася сваім рэвалюцыйным настроем. Тут была створана падпольная ячэйка КСМЗБ, сакратаром якой з'яўляўся Аляксандр Грышэнь.

Рэвалюцыйна настроеныя маладыя людзі былі адчаяннымі, ініцыятыўнымі. То яны агітуюць беднякоў не плаціць падаткаў, то вывясяць чырвоныя сцягі на тэлефонных слупах, то на выбарах у сейм падсунуць свае нумары за рабоча-сялянскіх дэпутатаў.

На вечарынках яны спявалі рэвалюцыйныя песні, распаўсюджвалі нелегальную літаратуру, лістоўкі. Іх праследвалі, кідалі ў турмы, катавалі ў засценках дефензівы. Міхаіл Алізаровіч папаў у Картуз-Бярозу, іншыя – у Гродзенскую турму. Але барацьбіты не здаваліся.

… У 1939 годзе Чырвоная Армія вызваліла Заходнюю Беларусь ад польскіх паноў. І як толькі ўстанавілася Савецкая ўлада, Кавалі аднымі з першых арганізавалі ў сябе калгас, які назвалі «Іскра». Старшынёй выбралі актыўнага падпольшчыка, вязня Гродзенскай турмы Аляксандра Заміроўскага. Вялікі працоўны і палітычны пад'ём панаваў сярод працоўных. Людзі з навакольных вёсак сабіраліся ў Малой Бераставіцы на масавыя дэманстрацыі, прысвечаныя рэвалюцыйным святам. Ва ўсіх гэтых мерапрыемствах удзельнічалі і браты Іосіф і Аркадзь Бацяны. Аркадзь ужо быў тады мужам Ганны Паўлаўны.

22 чэрвеня чорная фашысцкая хмара насунулася на нашу краіну. З першых дзён акупацыі пачалася «чыстка» насельніцтва. Першымі склалі галовы ў в. Кавалі шэсць чалавек, сярод іх і Яўфімія Грышэнь. Віна яе заключалася ў тым, што была ў калгасе стаханаўкай і на мітынгу яна сказала некалькі слоў аб раўнапраўі жанчын з мужчынамі. Загінулі Аляксандр Рыбачок, Ілья Дарошчык, Аляксандр Сачок, Арсен і Дзяніс Лукашыкі.

Астатнія, даведаўшыся аб лёсе сваіх таварышаў, схаваліся, каб працягваць барацьбу з ворагам. Так зрабілі і браты Бацяны, былыя актывісты КПЗБ.

Прайшоў год. Немцы, здавалася, забылі пра іх. А восенню 1942 г. у хату Бацяноў уварваліся фашысты. Зрабілі вобыск, катавалі жанчын: «Дзе мужчыны?». Жанчыны паўтаралі: «Не ведаем». Затым фашысты

прымусілі пяцігадовага Мішу паказаць ім ямы і іншыя дамашнія сховішчы. Але ўсюды было пуста. Тады ўзамен братоў, Іосіфа і Аркадзя, фашысты ўзялі ў залог жанчын. За Іосіфа яны ўзялі 72-гадовую маці Пелагею, а за Аркадзя - яго жонку Ганну.

Праз некалькі дзён узялі ў залог і жонку былога старшыні калгаса Ганну Заміроўскую.

Усіх іх даставілі ў мястэчка Крынкі, дзе пасадзілі за краты. Кожны дзень іх катавалі, каб яны выдалі сваіх мужчын. Але жанчыны маўчалі. Тады нявольніц адправілі ў Саколку, дзе працягвалі катаванні. Нічога не даведаўшыся ад жанчын, іх адправілі ў беластоцкую турму.

І вось фашысты з ваўкоў вырашылі прыкінуцца авечкамі. Яны выдалі загад, каб усе, хто хаваецца, прыйшлі ў жандармерыю і зарэгістраваліся і што ім усё будзе даравана. Вывесілі аб'явы. Але ніхто гэтаму не верыў і не ішоў у пастку. А браты Бацяны даверыліся - з'явіліся да фашыстаў. Праўда, іх спачатку не арыштавалі. І яны былі некаторы час на волі. А ранкам 8 кастрычніка іх дом акружылі гестапаўцы, схапілі братоў Іосіфа і Аркадзя Бацяноў, адвезлі за 5 кіламетраў у пералесак і расстралялі.

А жанчыны пакутавалі ў турме. 72-гадовая маці Пелагея не вытрымала цяжкіх катаванняў, там і памерла.

Ганну Паўлаўну разам з іншымі вывезлі ў канцлагер Майданак, дзе яна значылася пад нумарам 31016, затым у Равенсбрук, а адтуль — у Брандэнбург. Закончыўся яе цяжкі, нечалавечы шлях у лагеры ў 180 кіламетрах ад Берліна. Многія тысячы нявольнікаў былі сагнаны сюды. Лагер быў абнесены дротам, па якім ішоў электрычны ток. Ганна Паўлаўна расказвае, як адзін раз пяць жанчын паспрабавалі ўцячы, але, дакрануўшыся да дроту, маментальна згарэлі.

Але прыйшоў канец фашысцкім вылюдкам.

Радасць атрыманай свабоды нельга перадаць словамі. Яе можа зразумець толькі той, хто пакутаваў у няволі і застаўся жыць.

Надзежда Ісакаўна Заміроўская, жыхарка в. Кавалі, 1967 год.